# Зямля, дзе пачаўся твой лёс

Сцэнарый краязнаўчага падарожжа

*Зала афармлена ў нацыянальным стылі. Кніжная выстава “Зямля, дзе пачаўся твой лёс”, кніжная выстава “Мая краіна – Беларусь”. Гучыць мелодыя “Напевы дубоў” А. Іванова.*

**Вядучы 1.** Добры дзень, паважаныя сябры! Добры дзень усім добрым людзям, якія прыйшлі да нас на краязнаўчае падарожжа “Зямля, дзе пачаўся твой лёс”. Падарожжа па родным краі, дзе вы пазнаёміцеся са старажытнымі гарадамі і замкамі Беларусі, з рэкамі і азёрамі, лясамі, і іх насельніцтвам, пройдзеце яе шляхамі-дарогамі. Пагаворым пра наш родны куток, пра мясціны, з маленства нам дарагія, пра тое, што жыве ў нашых сэрцах усё жыццё.

*Гучыць беларуская мелодыя.*

**Чытач**. Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой
Твой родны край, твая Айчына –
Жыццё тваё і гонар твой.
І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару,
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла
Бе- ла – русь.
Ю. Свірка

**Вядучы 2**. Я хачу правесці вас па зямлі, якая для мяне, і, мабыць, не толькі для мяне – даражэйшая за ўсё, самы ўтульны і чароўны кут.

Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вачамі васількоў, светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону, і пушчы, дзе горда нясуць свае кроны алені. Гэта бясконцыя жылы рэк, у якіх плешчуцца бабры і рыбы на захадзе сонца, і гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці.

**Вядучы 1**. Чароўны кут, стары казачны край – наша Беларусь. Са старажытных часоў жылі на гэтай зямлі нашы продкі, ці як прынята казаць, нашы бацькі і дзяды. Таму і называюць людзі землі сваіх продкаў “краем бацькоў”, в каб адна краіна адрознівалася ад другой, даюць ёй назву. Па назве амаль кожнай краіны мы з лёгкасцю разумеем, хто ў большасці тут жыве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Чытач.** Радзіма наша – Беларусь,
І колькі не шукай,
Не знойдзеш ты на ўсёй зямлі
Мілей, чым гэты край.
Не знойдзеш ты такіх людзей,
Іх сэрцы – дабрыня;
Яна струменіць, льецца ў свет
Крынічкаю штодня.
Таму ў жыцці не трэба быць
Няшчырым, сквапным, злым.
Не забывай, ты – беларус,
І заставайся ім.

**Вядучы 2**. Мы – беларусы – павінны памятаць пра гэта і ганарыцца гэтым. Каб звацца беларусам, каб Беларусь стала для цябе роднай, трэба ведаць пра сённяшні дзень. Таму наша падарожжа будзе адной з тваіх першых вузенькіх сцяжынак у родны край.

*Гучыць песня “Люблю цябе, Белая Русь”, словы У. Карызны, муз. І. Лучанка.*

**Вядучы 1.** Наш родны беларускі край! Ён прыгожы і па-свойму адметны на поўначы, на поўдні, на ўсходзе і захадзе. Ён прыгожы і непаўторны сваімі рэкамі і азёрамі, сваімі лясамі і лугамі, сваімі сцежкамі і дарогамі.

Вядучы 2. Белавежская пушча і Браслаўскія азёры. Што вы ведаеце пра Белавежскую пушчу?

*Далей ідзе паведамленне дзяцей*.

**Вядучы 1.** А зараз уявіце сабе, што вы стаіце на пагорку і адразу бачыце столькі азёраў перад сабой, колькі пальчыкаў на абедзьвух вашых руках. І гэта адбудзецца на самай справе, калі вы апынецеся ў Браслаўскім азёрным краі.

А што вы ведаеце пра гэты край?

*Ідзе паведамленне дзяцей.*

**Вядучы 2.** “Жамчужына Беларусі” – гэтыя словы пра прыгажосць двух азёр. Якіх? (Нарачы і Свіцязі). Што вы ведаеце пра іх?

*Паведамленне дзяцей.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Вядучы 1.** Белавежская пушча і Браслаўскія азёры, Палессе і Свіцязь, Налібокі і Нарач – усё гэта наша спадчына, якая аднойчы і назаўсёды даецца кожнаму разам з жыццём.

*Гучыць мелодыя "Спадчына", сл. Я. Купалы, муз. І. Лучанка.*

**Вядучы 2**. Спадчына! Якое простае слова і які няпросты сэнс! Спадчына – гэта народныя звычаі і культура, гэта наша родная мова, гэта веліч і слава народа.

**Вядучы 1**. Жыццё народа не мае зыходнага пункта. Ніводная дата не з'яўляецца пачынальнай: заўсёды нешта было і раней. Любыя веды аб мінулым набліжаюць яго на нас, выклікаюць жаданне даведацца пра былое яшчэ болей.

**Вядучы 2**. У кожным старажытным горадзе, у мностве старадаўніх вёсак, на шматлікіх палях, берагах рэчак і азёраў ёсць маўклівыя сведкі славутага ці чорнага мінулага – руіны замкаў, паселішчы, курганы.

**Вядучы 1**. Кожны замак мае сваю легенду, гісторыю, свае таямніцы. Напрыклад, і ў нашы дні многія вераць у прывід Нясвіжскага замка – Чорную панну. А ў Крэўскім замку сядзеў як вязень вялікі князь Вітаўт. Яму пашанцавала ўцячы адтуль з дапамогай жонкі, пераапрануўшыся ў вопратку яе служанкі, і пасля стаць сапраўдным гаспадаром і гарачым прыхільнікам нашай магутнасці і незалежнасці.

**Вядучы 2**. Мулер моцныя муры
Склаў калісьці ў Міры,
І стаіць магутны замак
Аж да сёння на гары.

Што вы ведаеце пра гэты замак?
*Далей ідзе паведамленне дзяцей.*
**Чытач.** Чую – сосны гамоняць,
Шэпчуць вербы пахілыя.
То маё Наднямонне –
Дарагое і мілае.
Я па сцежцы ступаю,
Што да Свіцязі сцелецца,
Пералескамі, гаем
І мурожнай аселіцай.
Пасвіў панскі тут статак
Грознай восенню босы я,
І гібеў тут мой бацька
Над чужымі пракосамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адышлі ўжо ліхія
Тыя дні, і не вернуцца.
Глянь, дарогі якія
Каля Нёмана сцеляцца!
Чую – сосны гамоняць,
Шэпчуць вербы пахілыя.
То маё Наднямонне –
Дарагое і мілае.

**Вядучы 1.** Край Прынямоння... непаўторны сваёй ціхай, някідкай прыгажосцю. Колькі паэтаў, мастакоў, кампазітараў натхніла гэта зямля са светлымі бярозкамі, каласістымі нівамі, бабровымі затокамі.

**Вядучы 2.** Як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Беларусі Гродзенская вобласць існуе з 20 верасня 1944 года. Да гэтага Прынямонне ўваходзіла ў склад Беластоцкай вобласці.

**Вядучы 1.** Створаная на захадзе Беларускай ССР і мяжуючая з Польшчай і Літвой, Гродзенская вобласць у 1944 годзе складалася з 15 раёнаў і гарадоў Гродна і Ліды. За 60 гадоў сваей гісторыі ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні вобласці адбыліся значныя змены.

**Вядучы 2**. Зараз у Грод зенскай вобласці 17 сельскіх і 2 гарадскіх раёны, 14 гарадоў, у тым ліку 6 – абласнога падпарадкавання: Гродна, Ліда, Ваўкавыск, Навагрудак, Смаргонь, Слонім, 3 гарадскія пасёлкі, у гарады раённага падпарадкавання выраслі Скідзель, Іўе, Свіслач, Дзятлава, Бярозаўка. На тэрыторыі вобласці знаходзяцца 19 пасёлкаў гарадскога тыпу, 192 сельскія саветы, 4375 населеных пунктаў.

**Вядучы 1**. Сучаснае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне Гродзенскай вобласці дазваляе эфектыўна ажыццяўляць і развіваць кіраванне і самакіраванне ў рэгіёне, паспяхова вырашаць задачы сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця прынёманскага краю.

**Чытач**. Край любы мой, добры, даверлівы –
Ліст кляновы ў далонях зямлі.
Ты надзеяй жывеш і павер’ямі,
Хоць вякі над табою сплылі.
Вочы сінія, неба высокае
Адбіваецца ў люстры азёр,
У бары песня з ветрам галёкае,
Голас выраю – нібы дакор.
Адгукаецца ў сэрцы мелодыя:
Дзве струны – жураўліны клін.
Той, хто мовай зямлі валодае,
Толькі той яе верны сын.
Край мой светлы, вятрамі астужаны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Так люблю цябе – сэрца шчыміць...
На вякі я з табою здружаны,
Без цябе – не спяваць мне, не жыць.

*Гучыць песня "Зямля мая", сл. У. Някляева, муз. Л. Закле*ўнага.

**Вядучы 2**. Ты мячамі і кулямі хрышчана,
Тут чужынцы касцьмі палеглі,
Ваўкавышчына, Ваўкавышчына,
Слаўны кут беларускай зямлі.
Пастаю над Няпутай бруістаю,
Травы хмеляць маю галаву.
Рад я небу і воблачку чыстаму,
Рад, што дыхаю тут і жыву.

**Вядучы 1.** Так пранікнёна, хораша і так трапна пісаў пра дарагія мясціны наш зямляк Сяргей Бандарэнка. І сапраўды: шчодрая на ураджаі матуля-зямліца, дзе штогод клоняцца долу важкія каласы і наліваюцца сокам залацістыя яблыкі, зведала на сваім вяку шмат выпрабаванняў.

**Вядучы 2.** Менавіта ў іх пераадоленні мужнелі і духоўна выраслі нашы продкі, раслі, прыгажэлі і добраўпарадкаваліся вёскі і мястэчкі Ваўкавышчыны.

**Чытач.** Па мясцінах памятных прайдуся,
Дзе шапоча казкі вецярок.
Я тваёю доляй ганаруся,
Ваўкавыск – мой слаўны гарадок.
Абыйду вакол твае абшары –
Ты мне любы зблізку і здалёк,
Над табой лунаюць песні-мары,
Ваўкавыск – рабочы гарадок.

**Вядучы 2**. Мала знойдзеш на Беларусі гарадоў, якія змаглі б сапернічаць з нашым Ваўкавыскам. Кожная з эпох упісвала сваю старонку ў яго слаўную гісторыю, пакідала след на яго абліччы.

Наш слаўны і маляўнічы куток, што мае тысячагадовую гісторыю, такі старажытны і такі малады.

**Вядучы 1**. Ну што ж, скажам усе разам "Добры дзень" нашаму гораду. Мы маем магчымасць паблукаць па яго вуліцах. І ў гэтым нам дапаможа наша кніжная выстава "Зямля, дзе пачаўся твой лёс".

*Агляд выставы.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Вядучы 2.** Горад Ваўкавыск – адзін з найбольш старажытных гарадоў Беларусі. У 2005 годзе ён адзначае сваё 1000-годдзе з дня афіцыйнага нараджэння.

**Вядучы 1.** Гісторыя Ваўкавышчыны, як і іншых куткоў роднай нашай Бацькаўшчыны, - неад’емная часцінка агульнай гісторыі беларусаў. Разам з усёй Беларуссю ваўкавысцы зведалі і варожыя разбуральныя набегі, і прыгнёт, аднак іх змянілі радасць перамог і здзяйсненняў.

**Чытач.** Я люблю сівых вякоў паданні,
Ды найбольш пачуць сягодня рад
Пераклічку цягнікоў уранні
І вясёлы смех тваіх дзяўчат.
Па шырокай плошчы я прайдуся,
Хай навее песню вецярок,
Я табой заўсёды ганаруся,
Ваўкавыск, - любімы гарадок.

**Вядучы 2.** А вы ведаеце, чаму наш горад Ваўкавыск носіць такую назву?
*Легенда пра Ваўкавыск.*

**Вядучы 1.** Прыгожая наша Ваўкавышчына. І людзі тут на дзіва добрыя, прыгожыя, працавітыя, улюбёныя ў хараство бацькоўскай зямлі.

**Вядучы 2**. Што ні вёска – то гняздоўе аматараў народнай творчасці, цудоўных майстроў і ўмельцаў, у працах якіх увасаблшяюцца паэтычная краса роднай прыроды, духоўнае багацце творцаў, шматвяковыя мастацкія традыцыі.
**Чытач.** Цяжкі шлях вяртання ў кут бацькоўскі,
Голас продкаў кліча з забыцця.
Як калісь, я змушаная зноўку
Мост масціць праз рэчышча жыцця.
Любы рэчкі берагі ў аіры,
І вада яе чарней начы...
Толькі я ў адно бясконца веру:
Плакаць мне над ёй няма прычын.
Плынь ракі ні жвірам не засыпаць,
Не зраўняць, як могілкі, з зямлёй,
Ваўкавыя – не Дняпро, не Прыпяць,
Але сілы ад ваўчыцы ў ёй.
Як ваўчыца дзетак не кідае,
За сабой вядзе свой дужы род,
Ваўкавыя – рэчка таго краю,
Дзе не знаюць, што такое звод.
Не звядзецца шлях да Ваўкавыска,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Kроў ваўкавычанаў – не віно.
Мудрасці ціхмяная калыска,
Я люблю, люблю цябе даўно.
Т.М. Мазур

**Вядучы 1.** Наша родная мясціна, наша Ваўкавышчына... І ў першую чаргу тая вёсачка, дзе ты нарадзіўся і вырас**.**

**Вядучы 2.** А цяпер паслухайце прыказкі пра тое месца, дзе кожны з вас нарадзіўся. Я буду чытаць, а вы падкажыце, калі ласка, апошнія словы.

Дарагая тая хатка, дзе нарадзіла мяне... (матка).
Родная зямелька, як зморанаму... (пасцелька).
Родная зямля мякчэй, як чужая... (пярына).
Няма смачней вадзіцы, як з ...(роднай крыніцы).
Усюды добра, а дома...(найлепш).

*Ціха гучыць мелодыя "Мой родны кут" на словы Я. Коласа.*

**Вядучы 1.** Вось і завяршылася наша падарожжа па незабыўных сцежках роднага краю. Няхай гэтыя светлыя ўспаміны заўсёды жывуць у вашых сэрцах, выклікаюць светлыя пачуцці, і няхай кожны з вас адчувае сябе сынам сваёй зямлі.

**Чытач.** Ад ветру гнуцца вербалозы,
Бяжыць дарога напрамкі.
Мой край – бялюткія бярозы
Абапал сіняе ракі.
Вясна ў небе вырай кружыць,
Ляцяць за сіні небакрай.
Не забывай ніколі, дружа,
Сваю зямлю, свой родны край.

Мой край – лугі і пералескі,
Крыніцы звон і шум лясны,
Мой край – блакітныя пралескі
На сцежках ранняе вясны.

*Далей гучыць мелодыя "Мой родны кут"*

Г. Свістун, Ізабелінская сельская бібліятэка, Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ